Г.В. Кудзіна г. Брэст

# ДЗЕЯННІ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ Ў ВЕРАСНІ 1939 г. У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

Пасля польска-савецкай вайны 1919–1921 гг. тэрыторыя Беларусі стала падзеленай між заваёўнікамі. Яе заходнія землі, што складалі 40 % усёй тэрыторыі, адпаведна тэксту Рыжскага мірнага дагавора былі далучаны да Польшчы. Агульная плошча Заходняй Беларусі склала 113 тыс.км², а насельніцтва было роўнае 4,6 млн.чалавек [1, с. 421].

Напрыканцы 30-х гг. над еўрапейскім кантынентам навісла рэальная пагроза другой сусветнай вайны. Германія пераўтварылася ў моцную мілітарызаваную дзяржаву, якая рэальна стала прэтэндаваць на новы падзел свету. Адной з першых у яе планах была Польшча.

Як вядома, Францыя і Англія імкнуліся накіраваць Германію ў першую чаргу на ўсход, а спробы стварыць антыфашысцкую кааліцыю праваліліся. Перамовы паміж Англіяй, Францыяй і СССР аб саюзе супраць Германіі вынікаў не далі.

У такіх умовах Савецкі Саюз выбраў прапановы германскага боку. У выніку шчыльнага супрацоўніцтва дзвух дзяржаў стала заключэнне пакта аб ненападзе з Германіяй ад 23 жніўня 1939 г., вядомым як "Пакт Молатава-Рыбентропа". Заключаныя пагадненні з'явіліся заканамерным вынікам новай сітуацыі, якая склалася ў Еўропе. У сувязі з агрэсіўнымі памкненнямі Германіі, палітычныя дзеячы краін Еўропы клапаціліся ў першую чаргу аб сваіх дзяржавах. У такіх умовах пакт даваў СССР пэўны выйгрыш часу для ўмацавання абароназдольнасці, а галоўнае – ствараў рэальныя знешнепалітычныя ўмовы для вяртання Савецкаму Саюзу Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Пад ударамі нямецкай арміі, якая 1 верасня 1939 г.уварвалася ў Польшчу, польская армія распалася, а яе ўрад пакінуў краіну. З пачатку нямецка-польскай вайны, нягледзячы на актыўныя захады з боку кіраўніцтва нацысцкай Германіі ўцягнуць у ваенныя дзеянні супраць Польшчы савецкія ўзброеныя сілы, кіраўніцтва СССР заняло пазіцыю чакання. У той жа час у газетах "Правда" і "Известия" пачалі друкавацца артыкулы, у якіх падкрэслівалася неабходнасць дапамогі беларускаму і ўкраінскаму насельніцтву. 6 верасня быў праведзены частковы прызыў запасных, а 1 верасня аддадзены загад аб утварэнні Беларускага і Украінскага франтоў [2, с. 121].

Беларускім фронтам камандаваў 42-гадовы камандарм 2-га ранга Міхаіл Пракопавіч Кавалёў. Начальнікам штаба з'яўляўся былы глава савецкай ваеннай місіі ў Берліне 45-гадовы камкор Максім Аляксеевіч Пуркаў. Беларускі фронт складваўся з 4 армій, Дзяржынскай конна-механізаванай групы, 23-га стралковага корпуса. Ен налічваў 200802 салдаты і афіцэры [3, с. 104]. Большасць ваеннаслужачых асабовага саставу Беларускага фронта складалі ўраджэнцы Усходняй Беларусі, па нацыянальнасці беларусы.

Войскам Беларускага фронта супрацьстаяла 45 тыс. польскіх салдат і афіцэраў, з якіх прыкладна палова не была ўзброена і не зведзена ў канкрэтныя воінскія часці. Уздоўж мяжы з БССР тонкай лініяй размяшчаліся польскія злучэнні, якія ўваходзілі ў склад корпуса пагранічнай аховы ў колькасці 8 тыс. чалавек і каля 2 тыс. маракоў Пінскай рачной флатыліі. Найбольш баяздольнай з'яўлялася самастойная аператыўная група "Палессе" пад камандаваннем генерала Ф.Клеберга, якому ўдалося сабраць каля 17 тыс. салдат і афіцэраў. Аднак з іх толькі палова была зведзена ў баявыя адзінкі і ўзброена [4, с. 110].

17 верасня а пятай гадзіне раніцы войскі Чырвонай Арміі рушылі насустрач немцам, якія ўжо выйшлі ў некаторых раёнах далей абумоўленай у сакрэтным пратаколе лініі. Вестка аб пераходзе Чырвонай Арміяй мяжы застала камандуючага польскімі войскамі Э. Рыдз-Сміглы ў г. Уладзіміры-Валынскім. Як камандуючы ён павінен быў прыняць рашэнне, ад якога залежаў лёс тысяч яго суайчыннікаў – салдат і афіцэраў.

Да яго гонару было прынята разумнае рашэнне. Быў аддадзены загад: "Саветы прыйшлі. Загадваю агульнае адступленне на Румынію і Венгрыю найкарацейшымі шляхамі. З Саветамі не ваяваць, толькі ў выпадку наступлення з іх боку ці спробы разбраення нашых падраздзяленняў" [5, с. 278-279].

У аператыўнае заданне Беларускага фронта ўваходзіла заняцце паўночна-ўсходніх зямель Заходняй Беларусі да мяжы з Літвой і Латвіяй па лініі рэк Піны і Прыпяці. Акрамя асноўных, кіраўніцтва фронта і армій таксама мела ў падпарадкаванні асобныя вайсковыя адзінкі, якія выконвалі для іх разведвальныя і іншыя спецыяльныя заданні. На некаторых накірунках наступу франтоў дзейнічалі дыверсійныя групы, утвораныя загадзя на тэрыторыі Польшчы.

Ваенныя дзеянні Чырвонай Арміі распачалі войскі НКУС, якія распрацавалі планы па ліквідацыі асобных груповак польскай арміі і прыступілі да іх ажыццяўлення.

У звароце ваенных саветаў франтоў гаварылася аб неабходнасці лаяльных адносін да польскіх ваеннаслужачых і дзяржчыноўнікаў, калі яны не аказваюць узбройнага супраціўлення. Авіяцыі забаранялася падвяргаць бамбардзіроўцы населеныя пункты.

Амаль паўсюдна часці рэгулярнай польскай арміі складалі зброю. Найбольшыя цяжкасці для Чырвонай Арміі 17 верасня стварылі аддзелы палкоў Польскага абарончага корпуса "Глыбокае" і "Вілейка", якія былі дадаткова ўзмоцнены вайскоўцамі-асаднікамі і паліцыянтамі і аказвалі адчувальнае ўзброенае супраціўленне. Згодна з польскімі крыніцамі зафіксавана каля 40 выпадкаў супраціўлення пагранічных патрулёў, а таксама баі пад Кобрынам, Гродна, Вільнюсам і Беластокам. Найбольш упартыя баі разгарнуліся 20-21 верасня ў Гродне, дзе 15-ы танкавы корпус панёс страты да 15 танкаў, было забіта 47 чалавек і 156 паранена [2, с. 142].

Такім чынам, з-пад польскай улады ў выніку вайсковай аперацыі былі вызвалены 17 верасня Маладзечна, Валожын, Карэлічы, Баранавічы. 18 верасня – Навагрудак, Слонім, Ліда; 19 – Вільня, Пружаны; 21 – Гродна, Пінск. 22 верасня 23-я танкавая брыгада пад камандаваннем С.М. Крывашэіна ўступіла ў Брэст. На Кобрынскім мосце ім была арганізавана членамі КПЗБ урачыстая сустрэча, у якой прымалі ўдзел жыхары бліжэйшых да горада вёсак: Ямна, Трышын, Вычулкі, Валкі і інш.

23 верасня 1939 г. у Брэсце адбыўся сумесны парад савецкіх і нямецкіх войскаў. Гэта быў дыпламатычны жэст, які афіцыйна замацоўваў права знаходжання Чырвонай Арміі ў Брэсце. Нямецкія войскі адразу пасля параду накіраваліся цераз Буг, па якому ў адпаведнасці з савецка-германскім дагаворам ад 28.09.1939 г. "Аб дружбе і граніцы" павінна была прайсці мяжа паміж СССР і Польшчай па так званай "лініі Керзона" [5, с. 281].

Апошнімі вайсковымі сутычкамі з'явіліся баі на паўднёвым крыле Беларускага фронта, дзе адзінкі 4-ай арміі ўступілі ва ўзаемадзеянне з часцямі ахоўнага аддзела "Палессе". Сутычкі працягваліся да 29-30 верасня, але істотнай ролі ўжо на адыгрывалі.

Да 1 кастрычніка 1939 г. Чырвоная армія, не панесшы вялікіх стратаў цалкам выканала пастаўленыя задачы і вызваліла тэрыторыю Заходняй Беларусі.

У выніку гэтай акцыі Савецкі Саюз атрымаў пэўны час для ўмацавання сваёй абароназдольнасці напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны.

***Літаратура:***

1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / Беларус. Энцыкл.; рэдкал.: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) [і інш.] – Мінск: БелЭн, Гімназіі – Кадэнцыя. – Т. 3. - 1996. – 527 с.
2. Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: гісторыя і сучаснасць: матэр. міжнар. навук.-тэарэт. канфер., Мінск 17-18 верасня 1999 г. / БДУ; адк. рэд. П.І. Брыгадзін, У.Ф. Ладысеў. – Мінск, 2000. – 333 с.
3. История второй мировой войны 1939–1945 гг. : в 12 т. / редкол.: Р.Р. Бысюк, Г.К. Киселев, А.П. Кондак [и др.] – Москва: Воениздат, Т. 2. - 1974. – 1982.
4. Lisewski K. Wojna polsko-sowiecka 1939. Londyn 1988.
5. Памяць: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. Брэст. У 2 кнігах. Кніга 1. – Мн., 1997.

Л.Ю. Малыхина г. Брест

## ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ У 1918–1919 гг.

У бягучым 2008 г. мы адзначаем 90-годдзе стварэння Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Дазвольце прыцягнуць вашу увагу да гісторыі вайсковых злучэнняў на тэрыторыі Беларусі ў паслякастрычніцкі перыяд. Фарміраванне воінскіх часцей, якія пазней увайшлі ў Чырвоную Армію Савецкай Расіі на тэрыторыі беларускіх гарадоў пачалося яшчэ ў першыя дні Кастрычніцкай рэвалюцыі. Згодна з ўспамінамі сучасніка падзей В.Г. Кнорына, 25 кастрычніка 1917 г., у $12^{00}$ гадзін, атрымаўшы тэлефанаграму з Петраграда аб перамозе рэвалюцыі, Прэзідыум Мінскага Савета выдаў свой прыказ № 1 да насельніцтва, згодна з якім да $14^{00}$ гадзін перад будынкам Савета на вул. Петраградскай, № 6 пачалі выстраівацца вызваленыя з турмаў і гаўптвахт палітычныя арыштаваныя, салдаты фронта, бальшавікі (прыкладна колькасцю 1000 чалавек). Яны ўжо ў турме, пад кіраўніцтвам прапаршчыка Рэмнёва самаарганізаваліся ў воінскую адзінку, разбітую на роты, узводы і аддзяленні, і асноўнай задачай на гэты дзень стала атрыманне зброі. Тым часам члены Выканкама Мінскага Савета паспелі ўжо канфіскаваць з артылерыйскіх складоў неабходную колькасць вінтовак, кулямётаў і амуніцыі. У хуткім часе зброя была раздана, сфарміраваны 1-ы рэвалюцыйны полк імя Мінскага Савета, які павінен быў абараняць савецкую ўладу. Гэта быў першы крок да стварэння часцей Чырвонай Арміі ў Заходняй вобласці.[1] Для распаўсюджання савецкай улады на ўсю Беларусь і фронт 26 кастрычніка, ўвечары, было вырашана ўтварыць Ваенна-рэвалюцыйны камітэт Заходняй вобласці і фронта на чале з А.Ф. Мясніковым (Мяснікянам).

---

[1] Заходняя вобласць – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка РСФСР з цэнтрам у Смаленску, куды была ўключана тэрыторыя такіх беларускіх губерній як Смаленская, Віцебская, Магілёўская і Мінская.